# РЭЗАЛЮЦЫЯ РЭСПУБЛІКАНСКАГА НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАГА СЕМІНАРА «БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ: ВОПЫТ, МЕТОДЫКА І ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ»

***Аргкамітэт рэспубліканскага навукова-практычнага семінара «Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў» падагульніў вынікі работы дзвюх секцый «Этнаграфія і краязнаўства», «Археалогія і антрапалогія». Выказаныя прапановы вырашана ўвасобіць у наступных палажэннях:***

- ***Адзначаючы той факт, што Полацкі дзяржаўны універсітэт склаўся як адзін са значных цэнтраў каардынацыі намаганняў даследчыкаў гісторыі Беларускага Падзвіння, з улікам значнасці Полацка як старажытнага навукова-асветніцкага цэнтра Беларускага Падзвіння і актуальнасці разглядаемых на семінары пытанняў праводзіць навукова-практычны семінар рэгулярна, не радзей аднаго раза на два гады, з наданнем статусу «міжнародны».***
- ***Падтрымаць ініцыятыву кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі УА «Полацкі дзяржаўны універсітэт» аб стварэнні на базе ПДУ вучэбнай лабараторыі па палявому археолага-этнаграфічнаму і антрапалагічнаму вывучэнню Беларускага Падзвіння.***
- ***Падтрымаць ініцыятыву кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі УА «Полацкі дзяржаўны універсітэт» па прадаўжэнню выдання на базе ПДУ вучэбна-хрэстаматыйнага выдання «Полацкі этнаграфічны зборнік».***
- ***Падтрымаць ініцыятыву кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі УА «Полацкі дзяржаўны універсітэт», Полацкага гарадскога выканаўчага камітэта па арганізацыі і дзейнасці пастаяннай археалагічнай экспедыцыі ў г. Полацку сумесна са спецыялістамі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.***

*Аргкамітэт рэспубліканскага навукова-практычнага семінара*
*«Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў»*
*выказвае падзяку Пасольству Рэспублікі Азербайджан,*
*Кангрэсу Азербайджанскіх абшчын Беларусі*
*і асабіста Міралі Міраліеву ў дапамозе арганізацыі канферэнцыі.*